*Ева Лявонава*

# КАНТАМІНАЦЫЯ БІБЛЕЙСКІХ АЛЮЗІЙ ЯК ТВОРЧЫ ПРЫЁМ У. КАРАТКЕВІЧА (РАМАН «ХРЫСТОС ПРЫЗЯМЛІЎСЯ Ў ГАРОДНІ»)

Раман У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1966) займае асаблівае месца ў беларускай літаратуры ХХ ст.: гэта адно з самых значных мастацкіх асэнсаванняў біблейскага матэрыялу. У складанай сістэме твора, насычанага цытатамі і эпіграфамі, алюзіямі і рэмінісцэнцыямі, біблейская канстанта з'яўляецца стрыжнёвай; выконваючы сюжэта- і структурастваральную функцыю, не меншую ролю яна адыгрывае ў гісторыясофскай парадыгме кнігі, у стварэнні яе канцэптуальнай прасторы. У рамане задзейнічаны і самыя істотныя, першасныя біблейскія матывы і вобразы, і паасобныя дэталі. Пры гэтым аналогіі з Першакнігай знарок аголены, дэкларавaны і праз назвы твора ў цэлым і асобных яго раздзелаў, і праз яго топіку, эпіграфы, персанажаў, падзейны ланцуг, ці не кожнае звяно ў якім «рыфмуецца» з адпаведнымі біблейскімі рэаліямі. Нарэшце, сама жанрава-стылёвая поліфанія рамана выклікае асацыяцыі з архітэктонікай і атмасферай Бібліі – адначасова хаатычнай і гарманічна-касмічнай. Па глыбіні пранікнення ў біблейскі свет знаўцы ставяць раман У. Караткевіча ў адзін шэраг з найлепшымі творамі сусветнай літаратуры.

Істотныя функцыі ў творы, разам з іншымі складнікамі яго найбагацейшай мастацкай структуры, выконвае прыём кантамінацыі. На прыкладах жаночых персанажаў У. Караткевіча мы і паспрабуем гэтыя функцыі выявіць.

Да найбольш пераканальных у псіхалагічных адносінах вобразаў рамана належыць, нароўні з галоўным героем – «мужыцкім Хрыстом» Юрасём Братчыкам, вобраз Марыны Крывіц, на драму жыцця якой пісьменнік экстрапалюе лёсы біблейскіх жанчын, найперш грэшніц.

Як вядома, жанчыны, у тым ліку грэшніцы, складаюць дастаткова вялікую частку насельнікаў біблейскага свету. На самую вядомую з біблейскіх грэшніц айцец А. Мень звяртаў спецыяльную ўвагу чытачоў: «Атаясамліванне Марыі Магдаліны з блудніцай, апісанай у Евангеллі ад Лукі (7 : 36–50), не мае асноў у самім біблейскім тэксце, а склалася ў лацінскай агіяграфічнай традыцыі, звязанай з іменем Грыгорыя Вялікага (VI ст.) [3, *242*]. Узгадаем да месца гісторыю даравання Ісусам грэшніцы ў доме фарысея Сымона: «І вось, жанчына з таго горада, якая была грэшніца, даведаўшыся, што Ён узляжыць у доме ў фарысея, прынесла алавастравы посуд з мірам; і, стаўшы ззаду каля ног Ягоных і плачучы, пачала абліваць ногі Ягоныя слязьмі і абціраць валасамі галавы сваёй, і цалавала ногі Яму, і мазала мірам. Бачачы гэта, фарысей, які запрасіў Яго, сказаў сам сабе: калі б Ён быў прарок, дык ведаў бы, хто і якая жанчына дакранаецца да Яго, бо яна грэшніца. Звярнуўшыся да яго, Ісус сказаў: Сымоне! Я маю нешта сказаць табе. Ён кажа: скажы, Настаўнік. Ісус сказаў: у аднаго пазыкоўца было два

даўжнікі: адзін вінен быў пяцьсот дынараў, а другі пяцьдзесят, але як што, яны не мелі чым заплаціць, ён дараваў абодвум. Дык скажы, каторы з іх болей палюбіць яго? Сымон адказаў: думаю, той, каму больш даравана. Ён сказаў: правільна ты разважыў. І, абярнуўшыся да жанчыны, сказаў Сымону: ці бачыш ты гэтую жанчыну? Я прыйшоў у дом твой, і ты вады Мне на ногі не даў, а яна слязьмі абліла Мне ногі і валасамі галавы свае абцерла; ты цалавання Мне не даў, а яна, з той хвіліны, як Я прыйшоў, не перастае цалаваць Мне ногі. Ты галавы Мне алеем не памазаў; а яна мірам намасціла Мне ногі. А таму кажу табе: даруюцца грахі ёй многія за тое, што яна палюбіла многа: а каму мала даруецца, той мала любіць. А ёй сказаў: даруюцца табе грахі. І тыя, што ўзляжалі з Ім, пачалі гаварыць самі сабе: хто гэта, што і грахі даруе? Ён жа сказаў жанчыне: вера твая ўратавала цябе, ідзі з мірам» (Лк 7 : 36–50).

**Далей у Евангеллі ад Лукі сказана, што «Марыя, якая называлася Магдалінаю, з якой выйшлі сем д'яблаў», разам з іншымі вылечанымі ад злых духаў і хвароб жанчынамі суправаджала Хрыста і Яго апосталаў у іх падарожжах па гарадах і вёсках (Лк 8 : 1–3). Але ж імя грэшніцы, дараванай Хрыстом у доме фарысея Сымона, не паведамлялася, у сувязі з ёю не ішла размова аб выгнанні «сямі д'яблаў», тым не менш на працягу многіх стагоддзяў яна і Марыя Магдаліна ўспрымаюцца як адна асоба; гэтае замацаванае традыцыяй атаясамліванне дае аб сабе знаць і ў сучаснай біблеістыцы.**

Цікавыя тлумачэнні з нагоды дараванай Ісусам грэшніцы і Марыі Магдаліны як асоб цалкам аўтаномных змяшчае 9-ы том «Тлумачальнай Бібліі» (1912).

Пра тое, што жанчына, якая наведала дом фарысея Сымона, была грэшніцай, інакш кажучы – блудніцай, каментатар піша: «Была – прошлы незакончаны час, які азначае не тое, што жанчына ў гэты час працягвала сваё грэшнае жыццё, а тое, якою яна ўяўлялася яе суграмадзянам, якія, напэўна, яшчэ не ведалі пра яе вяртанне на шлях ісціны» [4, *175*].

Што датычыцца Марыі Магдаліны, «з якой выйшлі сем д'яблаў», то, паводле каментатара, які ў сваю чаргу адсылае нас да нямецкага тлумачальніка Новага Запавету Ёгана Вейса, гэтыя словы азначаюць «надзвычайную сілу апантанасці д'ябламі: сем – на мове Свяшчэннага Пісання ёсць сімвал паўнаты…тут указваецца на тое, што Марыя сем разоў на працягу свайго жыцця падпадала пад уладу вар'яцтва. У адносінах жа да даволі распаўсюджанага рацыяналістычнага падыходу, нібыта Марыя была проста вельмі распусная ў маральным сэнсе жанчына... то супраць такога разумення гаворыць ужытае і да Марыі паняцце «вылечаная», якое азначае цудоўнае вылячэнне ад сапраўднай, а не ўяўнай хваробы вар'яцтва» [4, *178*]. Інакш кажучы, Марыя Магдаліна магла быць цяжка хворай, але не блудніцай. Апроч іншага, у гэтай жа «Тлумачальнай Бібліі» пададзены прыклад яшчэ аднаго атаясамлівання дзвюх розных біблейскіх гісторый: памазання ног Хрыста грэшніцай у доме фарысея Сымона і пазнейшага памазання галавы Хрыста жанчынай у Віфаніі, у доме пракажонага Сымона (Мц 26 : 6–13), у той час як у другім выпадку гаворка ідзе зусім не пра грэшніцу, а пра вучаніцу Хрыста.

Гэтыя нюансы, безумоўна, трэба мець на ўвазе пры «міфарэстаўрацыі» (паняцце ўведзена ў навуковы ўжытак расійскім вучоным С. Цялегіным) біблейскіх жаночых персанажаў у кожнай іх мастацкай рэцэпцыі, з раманам У. Караткевіча ўключна, у якім Марына Крывіц, «былая пасомая» спачатку біскупа Камара, а пазней – кардынала Лотра, якраз і з'яўляецца алюзіяй на грэшніцу Марыю Магдаліну, іначай кажучы – у працяг усталяванай традыцыі – алюзіяй на дзвюх розных біблейскіх жанчын.

Тэма «вялікай блудніцы» (і, адпаведна, тэма грэшніцы Марыі Магдаліны) непасрэдна ўваходзіць у раман з XIII раздзела; на трактоўку вобраза Марыны Крывіц як біблейскай грэшніцы ў тэксце «працуе» многае – і на філасофска-этычным, і на эстэтычным узроўнях. «Смертаноснай» назаве прыгажосць Марыны разьбяр Кляонік, і ён жа заўважыць: «Я з яе Магдаліну рэзаў бы» [2, *157*]. Пазней Магдалінай назаве Марыну Лотр. Але апавядальнік настойліва працягвае намечаную на першых старонках твора антытэтычную лінію ў адлюстраванні натуры і паводзін гераіні і неадназначнага ўспрымання яе людзьмі. Адзін з самых дальнабачных персанажаў рамана, Кашпар Бекеш, кіне нібы мімаходам: «…мне здаецца, не можа быць хлуслівай гэткая прыгажосць… не веру, што дрэнь» [2, *157*]. Аднак праз многія выпрабаванні пройдзе Марына, перш чым спраўдзяцца словы Бекеша.

З моманту сустрэчы Братчыка з падасланай да яго Лотрам Марынай (раздзел XVI «Саронская лілея») будзе гучаць пераважна адно імя – Магдаліна. Так алюзія на вобраз біблейскай грэшніцы замацуецца намінатыўна, а імя, як вядома, ужо ёсць цытата. «Працытаванае», прамоўленае, яно яшчэ да поўнага разгортвання падзей адсылае наша ўяўленне да першасюжэта. Больш таго, яно ў пэўнай ступені рэпрэзентуе папярэднія і наступныя інтэрпрэтацыі вобраза Магдаліны, што «прасвечваюць» праз Караткевічаву версію. Бо, як бы далёка ні адыходзілі розныя аўтары ад першавобраза, усё ж некаторыя яго істотныя параметры захоўваюцца нязменнымі і ўяўляюць сабой пункты судакранання, тыпалагічныя сыходжанні розных яго тлумачэнняў. Гэта цалкам датычыцца і прыёму кантамінацыі: супакладанне грэшніцы і вылечанай мае месца ва ўсіх вядомых літаратурных «прачытаннях» вобраза Марыі Магдаліны (раманы «Евангелле ад Іуды» Г. Панаса, «І стаў той камень Хрыстом» М. Атэра Сільвы і інш.).

Аднак з асэнсаваннем вобраза Марыны як грэшніцы, «блудніцы» не ўсё так проста. Узгаданы ўжо раздзел XIII, сапраўды мае назву «Вялікая блудніца» і эпіграф: «І цары зямныя любадзейнічалі з ёю, і купцы зямныя ўзбагацелі ад вялікай раскошы яе… выйдзі ад яе, народ мой, каб не ўдзельнічаць вам у грахах яе і не зазнаць язваў яе… Колькі славілася яна і раскашавала, столькі аддайце ёй у адплату пакут і горкіх нягодаў» (Апакаліпсіс, гл. 18 : 3, 4, 7) [2, *151*]. Аднак у Адкрыцці апостала Іаана Багаслова (Апакаліпсісе) «вялікая блудніца» – гэта горад Вавілон, найграхоўнейшы, маральна заняпалы, загразлы ў распусце і хлусні, багахульніцтве, нянавісці і гвалце: «…Вавілон, вялікая блудніца, зрабіўся

жыллём д’яблаў і прыстанішчам усякага нячыстага духу… шалёным віном блуду свайго яна напаіла ўсе народы… За тое ў адзін дзень прыйдуць на яе нечуваныя кары, смерць і плач і голад… гора, гора табе, вялікі горад Вавілон, горад моцны!...» (Апакаліпсіс, гл. 18 : 2, 3, 8, 10). Такім чынам, апакаліптычны кантэкст, да якога апелюе аўтар, распаўсюджвае семантыку вобраза «вялікая блудніца» перадусім на месца дзеяння, на топас, і на тых, хто ператварыў Гародню ў суцэльную апраметную для простых жыхароў.

Што да гераіні У. Караткевіча, то ў яе маральным развіцці ўвасоблены – адпаведна біблейскай сюжэтыцы – і матыў вылячэння. Вельмі важна, што разрыў Марыны з былымі гаспадарамі адбываецца не пад уплывам парывання ці інстынктыўнага жадання, – ён усвядомлены і выпакутаваны. У гэтым сэнсе звяртае на сябе ўвагу тэма кахання: ёй – і ў Караткевіча, і ў іншых аўтараў – спадарожнічае даўняя праблема хрысціянскай этыкі, якую ў свой час Караль Вайтыла, будучы Папа Рымскі Іаан Павел II, вызначыў як «прыўнясенне ў любоў любові», дзе «ў першым выпадку слова «любоў» азначае тое, што… фарміруецца паміж мужчынам і жанчынай; у другім жа – змест галоўнай запаведзі хрысціянскай веры» [1, *231*]. (Зліццё гэтых двух пачаткаў, можа, як нікім іншым было натхнёна апета Б. Пастарнакам).

Сімвалічна, што свой свядомы, цвярозы выбар Марына робіць у выніку шляху, пройдзенага побач з Братчыкам-Хрыстом. Метафара шляху, дарогі выконвае вельмі істотную функцыю ў Бібліі; «цяжкі шлях пазнання» з’яўляецца парадыгмай чалавечага жыцця і нязменна асацыіруецца з пошукам, абнаўленнем, спасціжэннем светапарадку, а чалавек здаўна прыпадабняецца да падарожніка, вандроўніка, пілігрыма. Як і для Братчыка, для Марыны дарога выпрабаванняў абарочваецца духоўна-душэўным сталеннем і ўзвышэннем. Яна таксама прайшла свой крыжовы шлях; слова «распятая» неаднойчы гучыць у рамане. Паказальна, што сам Братчык заве Марыну не Магдалінай, а «дзяўчынкай» або «жанчынай». Асаблівае значэнне набываюць яго словы, ключавыя ў дачыненні да гераіні; маючы на ўвазе цяжкі стан, хваробу і ўсё перажытае Марынай, Юрась прамаўляе: «Гэ, ды ты зусім паганая. Кепская, як беларускае жыццё» [2, *296*]. Так яе лёс прыпадабняецца да лёсу шматпакутнай Радзімы. Адбываецца, паводле біблейскага сюжэта, і дараванне Марыны-грэшніцы Братчыкам-Хрыстом: «Няма правіны. Ні тваёй, ні маёй і нічыёй іншай. Яны аблыталі тут усё. І ўсё трымалі пад сякерай. І ўсім на гэтай зямлі зламалі жыццё. І знявечылі хлуснёю цябе» [2, *370*].

Відавочнае, такім чынам, галоўнае разыходжанне алюзіі на Магдаліну Караткевіча з Магдалінай біблейскай. Апошняя паверыла ў Хрыста імгненна, перайначылася раптоўна; яе ператварэнне – цуд у шэрагу іншых цудаў Хрыста. Марына ж, падобна да Братчыка і многіх насельнікаў Гародні, сталее і духоўна расце паступова; праз гэта яе вобраз набывае пераканаўчасць, даставернасць, бо канкрэтны, рэальны чалавек амбівалентны, у ім супрацьлеглыя пачаткі фундаментальнай антыноміі «дабро – зло» не так кардынальна палярызаваны, як у істоце міфалагічнай.

Прыём кантамінацыі ў алюзіўным полі гераіні Караткевіча не вычэрпваецца, аднак, спалучэннем грэшніцы і хворай. У раздзеле «Вялікая блудніца» не толькі атрымлівае працяг гісторыя Марыны Крывіц, але і адбываецца знаёмства чытача з новым жаночым персанажам – Анеяй. У святле нашай тэмы сімвалічны сэнс набывае акалічнасць пэўнай блытаніны, якая ўзнікла ў час размовы Лотра з Братчыкам. На нейкі момант Марына і Анея аказаліся ў натоўпе побач, і Юрась, чый позірк міжвольна ўпаў на мечнікаву дачку, пытаецца пра яе ў Лотра: «Хто гэта там?» Лотр жа лічыць, што Братчык мае на ўвазе Марыну, таму адказвае: «Тая?.. Магдаліна… Лілея далін» [2, *166*]. Вырашыўшы, што знайшоў слабае месца Юрася, Лотр і абяцае яму, разам з «пакланеннем… царствамі… багаццем», «дзеўку гожую», «Лілею» [2, *168*]. Дзеля дасягнення сваіх каварных мэт ён гатовы адмовіцца ад наложніцы, тым больш што сам паспеў запаліцца шалёнай жарсцю да Анеі.

Паказальна, што для Лотра з Лілеяй асацыіруецца грахоўнасць (Марына), а для Братчыка – «святасць», чысціня (Анея). Адсюль яго гнеўная водпаведзь: «Бач, ашчаслівілі. Сам знайду сваю дзеву Марыю…» [2, *168*]. Найвышэйшае ўвасабленне чысціні і святасці ў Бібліі – сапраўды дзева Марыя, і менавіта гэты біблейскі персанаж «цытуецца» ў адпаведных эпізодах з Анеяй (дастаткова спаслацца на назву раздзела «Марыя, Пан Бог з табой…» і на адзін з эпіграфаў да яго – словы з песні баркалабаўскіх старцаў: «Маці Божая па муках хадзіла, / Па цямніцах, па пекле блукала») [2, *172*].

Між тым наступны – пасля ўзгаданага вышэй – раздзел ужо і назву мае «Саронская лілея». Тут таксама гаворка ідзе пра Анею: у ахопленым трывогай за яе лёс Братчыку Марыне ўдаецца пасеяць яшчэ большую няпэўнасць і сумненні ў вернасці і шчырасці каханай, навесці яго на думку аб яе здрадзе. Дык хто ж тут, Анея або Марына, асацыіруецца з «Саронскай Лілеяй»?

Як вядома, вобраз Лілеі сустракаецца ў Песні песень: «Я нарцыс Саронскі, лілея далін! Як лілея паміж цёрнамі, так каханая мая паміж дзяўчынамі» (2 : 1–2). Толькі аднойчы гэтая «каханая» названа па месцы паходжання (з Сулама) Суламітай (Суламіф): «Азірніся, азірніся, Суламіта…» (7 : 1). Многае з біблейскай гісторыі Суламіты-лілеі можа быць экстрапалявана на гісторыю Анеі і Юрася, у прыватнасці абставіны, калі Суламіта не можа стрываць бязмежнага жадання знайсці свайго каханага і ідзе на яго пошукі («…я шукала яго і не знаходзіла яго; клікала яго, і ён не адклікаўся мне…»; 5 : 6), а ён тым часам пакутуе без яе: «Паланіла ты сэрца маё, сястра мая, нявеста! (4 : 9). Увасобленыя ў Песні песень падзеі і пачуцці даследчыкі біблейскіх тэкстаў тлумачаць па-рознаму. Напрыклад, Ф. Скарына ў прадмове да свайго перакладу гэтай кнігі ўспрымае яе змест выключна як апалогію Божай любові, як містычны «шлюб» Хрыста з ягоным зямным царствам – хрысціянскай царквой: «Яко любовник ко любой своей, или яко жених к невесте своей, тако и Христос ко церкви своей сниде, внегда воплощение принял ест ис пречистое дивици, матери своея Марии… Яко же на браку бывають разноличьные твари: первая ест жених, вторая – невеста…

тако же и во книзе сей… Глас Христов – он же ест жених; глас церкви Христовы, еже невеста ест… А тако пророковал ест царь Саломон… под приповестию жениха ис своею невестою о любви розмолвяющих, даючи нам науку…» [5, *55–56*]. Іншыя, аднак, схільныя бачыць у Песні песень не толькі ўзвышанае, але і зямное пачуццё. У любым выпадку асацыяцыя Анеі з «саронскай лілеяй», безумоўна, самая дарэчная; але патэнцыяльна, калі мець на ўвазе духоўнае развіццё Марыны Крывіц, яе вяртанне да жыцця «ў Хрысце», то і паралель паміж ёю і біблейскім вобразам «саронскай лілеі», бадай, не падасца няслушнай.

Самы, аднак, паказальны прыклад свядомага выкарыстання Караткевічам прыёму кантамінацыі месціць адзін з заключных раздзелаў рамана, калі мужыцкаму Хрысту прымроілася цудоўная сустрэча з богам Саваофам на утапічна дасканалай беларускай зямлі: Марына і Анея, Магдаліна і Марыя зліваюцца ў адным вобразе – гасціннай і ветлівай Дзевы Марыі («Марыя, вельмі падобная на Анею і Магдаліну, разам узятых, кланялася нізка…») [2, *464*].

Відавочна, такім чынам, што праз мастацкую кантамінацыю біблейскіх алюзій персанажы рамана, прынамсі жаночыя, узбагачаюцца, ускладняюцца як у этычных, так і ў эстэтычных адносінах.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Войтыла К.* Любовь и ответственность: Фрагменты книги // Иностранная литература. 1991. № 7.
2. *Караткевіч У.* Збор твораў: У 8 т. Мн., 1990. Т. 6.
3. *Мень А.* В поисках подлинного Христа: Евангельские мотивы в западной литературе // Иностранная литература. 1991. № 3.
4. Толковая Библия: В 12 т. Пб., 1912. Т. 9.
5. Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. даведнік. Мн., 1988.